# Талент, непадуладны часу

## (рэцэнзія на кнігу А. І. Смоліка «Божы дар Івана Кандрацьева»)

*Т. Ф. Сухоцкая*

**Эпоха нацыянальнай самасвядомасці сёння аднаўляе і паскарае працэсы палітычнага і культурна-нацыянальнага развіцця, вяртае з гістарычнага забыцця духоўную і культурную спадчыну. Кніга вядомага культуролага і даследчыка А. І. Смоліка «Божы дар Івана Кандрацьева» — гэта адкрыццё і ўзнясенне на небасхіл нацыянальнай культуры яркай, самабытнай, таленавітай зоркі — Івана Кандрацьева, пісьменніка, паэта, драматурга, перакладчыка, даследчыка XIX стагоддзя. Воляю гістарычнага лёсу творчы патэнцыял нашага суайчынніка выявіўся ў час жыцця ў Расійскай імперыі. Даследаванне творчай спадчыны слаўнага сына беларускай зямлі, увядзенне яе ў агульначалавечы культурны кантэкст адкрываюць новыя перспектывы не толькі ў беларускім літаратуразнаўстве, але і ў іншых галінах гуманітарыстыкі. Духоўны змест твораў выдатнага дзеяча культуры, інтэнсіўны характар грамадзянскай і творчай эвалюцыі асобы пісьменніка скіраваны на сцвярджэнне каштоўнасці гуманістычнага ідэалу ў гісторыка-культурным працэсе.**

У цэнтры ўвагі даследавання А. І. Смоліка знаходзіцца асоба І. Кандрацьева ва ўсёй шматзначнасці яе сувязей і стасункаў. Даследчык імкнецца ўзнавіць стыль жыцця літаратара, выявіць асяроддзе зносін, раскрыць сэнсава-каштоўнасны змест творчай спадчыны. Працу па рэканструкцыі творчага жыцця асобы Ю. Лотман справядліва называў «археалогіяй культуры». У навуковым плане дадзеная праца стварае аснову для фарміравання ў перспектыве гістарычнай персаналогіі як галіны беларускай культуралогіі, а абраны А. І. Смолікам метад даследавання, спалучэнне культуралагічнага аналізу творчай спадчыны з персаналістычным падыходам, з'яўляецца абгрунтаваным і перспектыўным.

З уступу да кнігі мы разумеем, якая вялікая, карпатлівая і напружаная работа стаіць за жаданнем даследчыка ўвекавечыць памяць аб сваім земляку. Кніга ўражвае шматаспектным падыходам да абранай тэмы і складаецца з дванаццаці структурных адзінак, якія тычацца жыццёвага, творчага, асабістага жыцця пісьменніка, эвалюцыі яго творчай манеры, жанрава-стылёвых адметнасцей яго твораў і іншых праблем.

Пранікнуць у творчую лабараторыю пісьменніка дапамагаюць імкненне даследчыка звязаць у адно цэлае ўспаміны сяброў і сучаснікаў І. Кандрацьева, лісты, крытычныя артыкулы, асабістыя дакументы, фотаздымкі. Сабраныя даведачныя, гістарычныя, аналітычныя, статыстычныя ды іншыя матэрыялы ўражваюць дакладнасцю, аб'ектыўнасцю, лагічна ўпісваюцца ў дыскурс даследавання. Увогуле ў сваёй кнізе А. І. Смолік шырока выкарыстоўвае звесткі з самых розных бібліяграфічных выданняў, архіўных крыніц, цытаванне і спасылкі на працы шэрагу выдатных даследчыкаў у галіне гуманітарыстыкі. Аўтар скрупулёзна асэнсоўвае небагаты, але дастаткова супярэчлівы часам крытычны матэрыял пра творчасць І. Кандрацьева і робіць абгрунтаваныя ўдакладненні, што спрыяюць стварэнню цэласнага вобраза нашага земляка.

Асэнсоўваецца спадчына І. Кандрацьева на сацыякультурным фоне эпохі, што дае чытачу магчымасць панарамнага ўспрыняцця часу, калі жыў і тварыў літаратар. У першых частках «Малая радзіма», «Кантаніст» А. І. Смолік лагічна вылучае вілейскі, віленскі, маскоўскі перыяды ў жыцці і творчасці І. Кандрацьева; распавядае пра гісторыю роднай вёскі Каловічы Вілейскага ўезда, род заняткаў насельніцтва, сям'ю будучага пісьменніка, перыяд навучання ў Смаленскай школе ваенных кантаністаў, куды залічвалі дзяцей салдат, і ў фельчарскай школе пры Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі. Зварот да дзяцінства і юнацтва І. Кандрацьева дапамагае зразумець вытокі яго духоўнасці.

У раздзеле «Вільня. Пачатак літаратурнай творчасці» падаецца інфармацыя, што ў другой палове 1860-х гадоў І. Кандрацьеў пачынае служыць у канцылярыі папячыцеля Віленскай навучальнай акругі і спрабуе пісаць вершы. Казённая служба і палітыка русіфікацыі, якая праводзілася на нашых землях пасля падаўлення нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863—1864 гадоў пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага, паўплывалі на фарміраванне светапогляду будучага майстра пісьменнасці. Піша ён свае творы на рускай мове ў рэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чышчы тагачаснай афіцыйнай ідэалогіі. Першы верш «Вільня 22-га кастрычніка 1868 года» (надрукаваны ў «Віленскім весніку») прысвечаны асвячэнню Прачысцінскага сабора. Гэта не толькі своеасаблівы каментарый палітыкі аднаўлення і пабудовы так званых мураўёвак на беларускіх землях, але і падсвядомы пошук упэўненасці ў будучыні. Царква выступае як сімвал духоўнасці, надзеі на аднаўленне. І. Кандрацьеў таксама не раз будзе імкнуцца асэнсаваць нацыянальна-вызваленчае паўстанне пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага. Наколькі набалелым гэта было, можна меркаваць па словах песні «По диким степям Забайкалья», аўтарам якой ён з'яўляецца.

У сваёй кнізе А. І. Смолік імкнецца акрэсліць вытокі мастацкага таленту І. Кандрацьева, акцэнтуе ўвагу на добрым веданні пісьменнікам народнай культуры, народнай песні.

У перыяд знаходжання ў Вільні малады літаратар спрабуе свой талент і ў драматургіі. П'ескі, сцэны, «жарты» («Сценка на Виленской толкучке», «Торг в местечках Северо-Западного края» і інш.) напісаны ў рэчышчы гутарковай плыні, характэрнай для ананімных твораў таго часу. Зварот да мастацкай інтэрпрэтацыі фальклору сведчыць пра схільнасць пісьменніка да рэалістычнага паказу жыцця. Верагодна, калі б лёс не адарваў І. Кандрацьева ад роднай зямлі, яго талент выявіўся б з выразнай нацыянальнай афарбоўкай.

Наступны раздзел кнігі А. І. Смоліка — «Масква. Зорны час» — прысвечаны перыяду росквіту таленту І. Кандрацьева. Пасля таго як наш суайчыннік быў узнагароджаны Вялікім залатым медалём у конкурсе п'ес для народных тэатраў на Першай Усерасійскай політэхнічнай выставе, яго творчы патэнцыял зацікавіў многіх вядомых творцаў: І. Сурыкава, У. Гіляроўскага, М. Успенскага, А. Саўрасава, І. Левітана, братоў Чэхавых. Творчыя стасункі і нават сяброўскія адносіны з гэтымі людзьмі ён пранёс праз усё сваё жыццё. У маскоўскі перыяд талент І. Кандрацьева выявіўся ў рэдактарскай справе, акцёрскай і літаратурнай дзейнасці. Разнастайнасць родаў, жанраў, шырокая тэматыка яго твораў па-сапраўднаму здзіўляюць. Эстэтычны густ І. Кандрацьева, як сцвярджае А. І. Смолік, фарміруецца пад уплывам творчасці жывапісцаў-пейзажыстаў А. Саўрасава, І. Левітана. Яскрава гэта бачна ў паэтызацыі прыроды Нёмана ў рамане «Гуны», у музычнасці вершаў «В лесу», «Первый снег», «Гроза». Прага да духоўнасці часта вымушала літаратара звяртацца да рэлігійных сюжэтаў. У сваёй кнізе даследчык удала прыводзіць цытаты з твораў І. Кандрацьева, каб чытач змог адчуць красамоўнасць, выразнасць і лаканічнасць стылю пісьменніка.



***Таісія Фёдараўна Сухоцкая,***
*кандыдат культуралогіі, дацэнт,*
*дацэнт кафедры культуралогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

Тэма Расіі стала аб'ектам асаблівай зацікаўленасці ў рускіх інтэлектуалаў XIX стагоддзя. І заходнікі, і славянафілы настойліва шукалі ў глыбінях гісторыі славянства і чалавечага духу энергетычны імпульс, здольны змяніць сацыяльнае быццё ў дзяржаве-імперыі. І. Кандрацьеў быў больш схільны да ідэі перабудовы і адраджэння рускай культуры на аснове сапраўднага нацыяналізму, у духу самабытнасці і самапазнання, без рабскага пераймання чужародных ідэй. Думаецца, што на акрэсленасць пазіцыі І. Кандрацьева паўплывала і канцэпцыя гісторыка-культурных тыпаў М. Данілеўскага (першыя главы «Расіі і Еўропы» надрукаваны ў 1869 годзе ў часопісе «Зара», а асобнае выданне выйшла ў 1871 годзе), сцвярджэнне ім прыярытэтнай культуратворчай ролі славянскага культурна-гістарычнага тыпу.

Шлях І. Кандрацьева да гістарычнай праўды ляжаў праз асэнсаванне расійскай рэчаіснасці ва ўмовах самадзяржаўя. Творца зыходзіў з таго, што няведанне мінулага з'яўляецца прычынай трагічных калізій сучаснасці. Мастацка-філасофская рэфлексія гісторыі Расіі ў творчасці Ф. Дастаеўскага, І. Рэпіна, М. Ге, М. Ляскова, М. Сурыкава папярэджвала аб пагрозе паўтарэння гістарычнага цыкла, у якім дзетазабойства і бацьказабойства з'яўляюцца спосабам самасцвярджэння ў грамадстве. Творчасць І. Кандрацьева скіравана на выкрыццё дэспатызму і асэнсаванне яго вытокаў у Расійскай імперыі. Паступовы зварот да нацыянальнай гісторыі ў культуры XIX стагоддзя суправаджа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ецца пераходам ад канцэпцыі індывідуальнага суб'екта да канцэпцыі суб'екта супольнага.

У цэнтры ўвагі І. Кандрацьева («Драма на Лубянцы», «Біч Божы» («Гуны»)) — праблема гістарычнай абумоўленасці становішча асобы, яе ўключанасці ў грамадска-сацыяльныя працэсы. Значную цікавасць пісьменніка выклікае ўклад канкрэтнай гістарычнай асобы ў працэс станаўлення генетычнага коду нацыі. Паказальнымі ў гэтых адносінах з'яўляюцца яго ацэнкі знакавых фігур гістарычных эпох: Ацілы, Эрманарыка, Валенцініяна, Напалеона, Кутузава і іншых. Проза І. Кандрацьева мэтанакіравана працуе на паглыбленае асэнсаванне сутнасці гістарычнага працэсу і чалавека ў ім.

Раман «Гуны» І. Кандрацьева — гэта не гістарычнае даследаванне, а мастацкі твор, у аснове якога ляжыць нетрадыцыйны погляд на гісторыю гунаў як аднаго са славянскіх плямёнаў венедаў і іх важака Ацілы. І. Кандрацьеў па-майстэрску рэканструюе мінулае на аснове тагачасных гістарычных канцэпцый і мастацкай інтуіцыі. У тэкст рамана ўключана плынь навуковага асэнсавання гістарычных падзей славянскай даўніны з пазіцый заходніх сярэдневяковых даследчыкаў, якія зыходзілі з адзінства народа славянскага і гунаў (Саксон Граматык, Адам Брэменскі, Гельмальд).

Адлюстраванне аўтарскай канцэпцыі ў рамане абумоўлена адметнасцю індывідуальнага стылю І. Кандрацьева — жывапіснага, каларытнага, аб'ёмнага. Пісьменнік па-майстэрску карыстаецца формай лубка (спрошчвае інфармацыю, падрабязна тлумачыць для лепшага ўспрыняцця і разумення простымі людзьмі), што падкрэслівае і ўзбагачае індывідуальнасць выкладання. Індывідуальны стыль літаратара абумоўлены разуменнем істотнай ролі характару адлюстравання гістарычных фактаў, ступені і глыбіні іх асэнсавання, сапраўднымі навуковымі ведамі пра гістарычныя падзеі мінулых эпох.

Краязнаўчыя нарысы з гістарычным аглядам і мастацтвазнаўчым аналізам артэфактаў «Седая старина Москвы» і «Московский Кремль» І. Кандрацьева — гэта вялікі ўклад і ў праваслаўную культуру. Абгрунтаванасць, навуковасць гэтых прац А. І. Смолік пацвярджае спасылкамі на Ніканаўскі летапіс.

Клопат пра будучае пакаленне, асвету дзяцей паспрыяў раскрыццю і выхаваўчых, навукова-метадычных здольнасцей нашага земляка, што знайшло адлюстраванне ў празаічных творах для дзяцей («Стёпка-растрёпка», «Снегурочка»), зборніку «Золотая струна», чытанках «В дружбе с природой», «Искра Божия». Важным элементам выхавання І. Кандрацьеў лічыў чытанне, таму ўвага пісьменніка засяроджана на тэксце, сэнсе. Аўтар кнігі «Божы дар Івана Кандрацьева» здолеў раскрыць значнасць і арыгінальнасць дадзеных прац І. Кандрацьева ў кантэксце тагачаснай педагагічнай парадыгмы, параўнаць яго ідэі з канцэпцыяй К. Ушынскага.

Вялікае значэнне ў разуменні індывідуальнасці пісьменніка мае раскрыццё семіётыкі (характару) паводзін вядомага літаратара. Непрыкаянасць і неўладкаванасць асабістага жыцця, схільнасць да багемных паводзін І. Кандрацьева аўтар кнігі тлумачыць не як прыватны момант яго біяграфіі, а як наканаванасць для многіх талентаў ва ўмовах тагачаснай тыраніі і прыгоннага рабства. Прадчуванне сацыяльнай катастрофы, пошук новых формаў сацыяльнага развіцця, выкрыццё дэспатызму і асэнсаванне яго вытокаў у Расійскай імперыі адлюстраваны ў творчасці Ф. Дастаеўскага, І. Рэпіна, М. Ге, М. Ляскова, М. Сурыкава. Творчы талент І. Кандрацьева развіваецца ў адзначаным кірунку.

Культуралагічнае асэнсаванне творчай спадчыны І. Кандрацьева толькі пачынаецца. Кніга А. І. Смоліка «Божы дар Івана Кандрацьева» спрыяе ўзбагачэнню інтэлектуальнага здабытку беларускага народа. Даследчык здолеў раскрыць унікальнасць таленту І. Кандрацьева, адметнасць яго мастацкага стылю, акрэсліць светапоглядныя пазіцыі пісьменніка, сцвердзіць гуманістычны патэнцыял яго творчасці.

### Спіс рэкамендаваных крыніц

1. *Данилевский, Н. Я.* Россия и Европа / Н. Я Данилевский. — М. : Книга, 1991. — 576 с.
2. *Кондратьев, И. К.* Бич Божий: Исторический роман. Божье знаменье: Повесть / И. К. Кондратьев. — М. : Панорама, 1994.
3. *Лавринец, П.* Русская литература Литвы (XIX — первая половина XX века) / П. Лавринец. — Vilnius: Vilniaus universitetas, 1999. — С. 45—49.
4. *Рейтблат, А. И.* Кондратьев Иван Кузьмич / А. И. Рейтблат // Русские писатели. 1800 — 1917: Биографический словарь / гл. ред. П. А. Николаев. — М. : Большая Российская энциклопедия, 1994. — Т. 3: К—М. — С. 48—50.
5. *Смолік, А. І.* Божы дар Івана Кандрацьева / А. І. Смолік; Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. — Мінск: БДУКМ, 2013. — 260 с.
6. Талент, непадуладны часу: Кандрацьеўскія чытанні (Вілейка, май 2013 г.) / пад навук. рэд. А. І. Смоліка; Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. — Мінск : БДУКМ, 2013. — 89 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ